**АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ АПЫТАННЯ ПА ЭТНАГРАФІЧНАЙ ТЭМАТЫЦЫ** (па матэрыялах палявога этнаграфічнага даследавання сярод насельніцтва Гомельскага раёна ў 2008–2011 гг.)

**У.М. Александронец** (УА "ГДУ імя Ф. Скарыны")
Навуковы кіраўнік – **А.Р. Яшчанка**, канд. гіст. навук, дацэнт

Сярод разнастайных спосабаў атрымання інфармацыі па этнаграфічнай тэматыцы важнае месца займае палявое этнаграфічнае даследаванне, матэрыялы якога дазваляюць найбольш поўна ахарактарызаваць вывучаемую з'яву, удакладніць раней вядомыя факты аб культурных традыцыях насельніцтва адпаведнага рэгіёна.

Мэтай аўтара з'яўлялася раскрыццё асноўных асаблівасцей правядзення апытання па этнаграфічнай тэматыцы. Палявыя даследаванні праводзіліся ў Гомельскім раёне на працягу 4 гадоў і закраналі разнастайныя аспекты святочнай культуры, рэлігійных традыцый, іх уплыву на побыт сельскіх жыхароў, адметнасці асобных прафесійных груп і г. д.

Падчас даследавання былі прыменены такія метады, як уключанае назіранне і экспедыцыя. Пры гэтым у працы з носьбітамі і інфарматарамі народнай традыцыйнай культуры важная роля адводзілася непасрэднаму кантакту, які выявіўся ў гутарках, апытанні і анкетаванні (па загадзя распрацаваных планах-апытальніках і анкетах).
За перыяд правядзення палявой этнаграфічнай працы былі наладжаны сустрэчы з 200 мясцовымі жыхарамі.

Характарыстыка элементаў традыцыйнай культуры закраналася ў працы з прадстаўнікамі карэннага насельніцтва пераважна сталага ўзросту, а ступень захаванасці і ўспрыняцця мясцовых культурных традыцый вызначалася на падставе дадзеных ад некарэнных жыхароў маладога ўзросту. Пры гэтым закранаўся фактар нацыянальнай і канфесійнай прыналежнасці рэспандэнтаў, сярод якіх большасць лічыла сябе беларусамі і праваслаўнымі. Звярталася ўвага на гістарычнае мінулае і геаграфічнае размяшчэнне населенага пункта, характар гаспадарчай дзейнасці рэспандэнтаў і г. д.
З мэтай удакладнення атрыманых звестак праводзіліся шматкратныя візіты і паралельныя апытанні.

Большасць рэспандэнтаў лічыла актуальнымі закранаемыя праблемы, а таксама даволі ахвотна адказвала на адпаведныя пытанні, найбольш поўна раскрываючы вывучаемыя аспекты. Сярод разгорнутых і грунтоўных адказаў – звесткі аб працэдуры святкавання прастольных святаў, аб каляндарнай і сямейнай абраднасці. У большасці выпадкаў жыхары праяўлялі адкрытасць, адсутнасць надакладнасцей і загадзя няпраўдзівых звестак, асэнсавана ставіліся да важнасці этнаграфічнай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ